немагчыма выкараніць з душы (“...О так! Я – пралетар!..”, “Сон” (“Заглянь, сынок, у соннік...”, “Сон” (Не помню дня і той мінуты...”), “Сон на кургане”). Верш “Быў гэта сон...” прадстаўляе чытачу новае значэнне лексемы *сон*. *Сон* тут замяняе словы *самаабман, надзеі, марныя спадзяванні*: “Быў гэта толькі сумны сон, // Што развяду я з ёй бяду, // Што пад яе напеваў звон // Лягчэй к магіле дабрыду” [5, с. 9].

Што ж такое сон? Чаму мы спім і снім сны? Што мы снім? Чаму пераказваем тое, што снім, іншым людзям? Як можна ўпэўніцца, гэтыя пытанні па складанасці сваёй могуць стаяць побач з пытаннямі пра пошук ісціны, пра сэнс быцця. Лексічныя значэнні слова *спаць* настолькі разнастайныя, што, каб зразумець, пра што ідзе гутарка, абавязкова патрэбны кантэкст, бо акрамя асноўных, зацверджаных слоўнікамі сэнсаў, кожны чалавек можа надзяліць яго яшчэ якім-небудзь сваім.

**Літаратура**


1. Арлоў У. Сны імператара: Апавяданні, аповесці, эсэ. Мінск: Маст. літ., 2001. 383 с. (Беларуская проза XX стагоддзя).
2. Баршчэўскі Я. Выбраныя творы / Уклад., прадм. і камент. М. Хаўстовіча. Мінск: Беларускі кнігазбор, 1998. 480 с.
3. Быкаў В. Збор твораў. У 6 т. Т. 2. Аповесці. Мінск: Маст. літ., 1992. 463 с.
4. Гётэ Ё.В. Фаўст: Трагедыя / Пер. з ням. і камент. В. Сёмухі; Прадм. А. Міхайлава. Мінск: Маст. літ., 1991. 406 с. (Скарбы сусветнай літаратуры).
5. Купала Я. Поўны збор твораў. У 9 т. Т. 4. Вершы, пераклады 1915–1929. Мінск: Маст. літ., 1997. 446 с.
6. Мележ І. Збор твораў. У 10 т. Т. 5. Людзі на балоце: Раман з “Палескай хронікі”. Мінск: Маст. літ., 1981. 415 с.
7. Овчаренко И.И. Сновидения. Сон. // Всемирная энциклопедия: Философия / Гл. науч. ред. и сост. А.А. Грицанов. М.: АСТ, Минск: Харвест, Совр. литерат., 2001. 1312 с.
8. Шэкспір У. Санеты. Трагедыі: З англ. / Уклад., прадм. і камент. В. Небышынца. Мінск: Маст. літ., 1989. 479 с.


**І.І. Шматкова**

## МАСТАЦКА-ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ АСАБЛІВАСЦІ ПЕЙЗАЖНАЙ ЛІРЫКІ Е. ЛОСЬ, Н. МАЦЯШ, Г. КАРЖАНЕЎСКАЙ

Чалавеку ўласціва імкненне да гармоніі, ён жадае бачыць яе ва ўсім. Але незаўсёды знойдзеш гармонію сярод соцыуму. Пераадолець трагізм светаўспрымання, знайсці выхад з бясконцага кола паўсядзённых праблем, адчуць агульную карціну ўсяго існага, глыбокую паяднанасць чалавека з

Сусветам дапаможа менавіта жыццё ў суладдзі з акаляючым асяроддзем, з прыродай.

Творчасць большасці паэтаў пачынаецца менавіта з захаплення прыгажосцю прыроды. Творца як бы адкрывае свой талент, здолеўшы ўбачыць і перадаць іншым замілаваны малюнак.

Е. Лось назвала свой першы зборнік “Сакавік”(1958), у якім перадала сваё захапленне веснавой прыродай. У сакавіку адраджаецца ад зімняга сну ўсё жывое, у сакавіку нарадзілася сама паэтка, з “Сакавіка” пачаўся яе творчы шлях. І гэты веснавы настрой паэтэса пранесла праз усю сваю творчасць. Дакладна А.І. Бельскі назваў яе “апантанай пясняркай вясны і кветак”.[1, с. 8] Ад радкоў яе шматлікіх вершаў пра вясну (“Сакавік”, “Дома”, “Успамін, не кранай галінкаю...”, “Сакавіцкая завея”, “Майскі цуд” і інш.) вее свежасцю фарбаў зялёнай лістоты, маладой травіцы, чысцінёй першай навальніцы. Аўтарка па-майстэрску выкарыстоўвае мастацка-выяўленчыя сродкі. Асабліва яе вершы насычаны метафарамі (*абуджаюцца зямныя сокі, дым туманоў* [2, с. 15], *вецер б’е, звоняць халады* [2, с. 278]; рэаліям нежывой прыроды паэтэса надае чалавечыя рысы, ужываючы ўвасабленні (персаніфікацыі): *з радасці хмарка заплакала* [2, с. 338], *дажджы зашэпчуць уначы* [2, с. 15]. А як жа можа быць іначай? Паэтычная душа заўсёды адносіцца да кожнай праявы навакольнага асяроддзя як да жывой істоты: будзь то травінка, кветачка, лісцік або сонца. неба, зямля. Е. Лось часта “размаўляе” з прыродай у сваіх вершах: *Ціхая просьба – Першаму грому: “Не пагражай Хлапчуку малому*”[2, с. 71]. Паэтэса адчувае сваю еднасць з прыродай, бачыць у гэтай еднасці сэнс гармоніі:

Сама адданая прыродзе,
каб з ёй дружылі ўсе – хачу.
З травой і лесам, на выгодзе,
я сына размаўляць вучу [2; с. 153].

У вершах Е.Лось шмат параўнанняў. Так чалавек, які не лічa сябе адарваным ад прыроды, заўважае многа падобнага ў сваім лёсе з “лёсам” дрэва, птушкі, жывёлы. Так, можа часовыя рамкі крыху іншыя, але прысутнічае ўсё тое ж нараджэнне, жыццё, смерць. І так як у прыродзе кожны цыкл пачынаецца занава, так і ў чалавечым жыцці хочацца верыць ў нейкае адраджэнне. Таму невыпадкова, напэўна, цяга паэтаў менавіта да

вясновага руху прыроды. У вершы “Сляды” Е. Лось параўноўвае гады з хвалямі вады:

Пралятаюць гады,
Праплываюць стагоддзі,
Нібы хвалі вады
Веснавога разводдзя [2, с. 22].

А ў пазнейшым сваім вершы “Мне людзі не даюць маіх гадоў...” (1976) ужо сталая паэтэса *ўдзячная сівой сваёй вясне* [2, с. 331], хоць і *сівой*, але ўсё ж такі *вясне*. Думаецца, ужыванне гэтага аксюмарана апраўдана.

Так жа як і ў паэзіі Е. Лось, так і ў творчасці Н. Мацяш лірычны герой паяднаны з прыродай, з яе вечнымі законамі. Як зазначае Л. Тарасюк: “У паэзіі Н. Мацяш выдатна перададзена словам ідэя неадольнасці руху, тая прагнасць абнаўлення, якой жыве ўся прырода (верш “Снягі абложныя прадвесне”)” [3, с. 30]. І зноў тая ж замілаванасць вясновым пейзажам.

Як і ў Е. Лось, у Н. Мацяш вясна прадвызначыла назву аднаго са зборнікаў – “Прыручэнне вясны” (1979). У паэтэс ёсць нават вершы з аднолькавай назвай “Сакавік”. І ў Е. Лось, і ў Н. Мацяш вершаваны радок энергічны, дынамічны, што дасягаецца частым ужываннем дзеясловаў: *Абуджаюцца, бродзяць, уецца, набіраюць, пабегчы* [2, с. 15]; *Разветрыла, растае, раскавана, вызваляе* [4, с. 60]. Трапна паэтэсы перадаюць тую магутную моц прыроды, з якой усё ажывае ў сакавіку, па-майстэрску скарыстоўваючы моўна-выяўленчыя сродкі. Але верш Н. Мацяш выдзяляецца палескім моўным каларытам: *Капеж аркестрам струнным раскавана Тарочыць гамы веснія свае* [4, с. 60], таксама яе верш больш кароткі, схематычны, нават графічны. Адзін з даследчыкаў паэзіі А. Ігнацюк параўноўвае верш “Сакавік” Н. Мацяш са знакамітым пейзажам А. Саўрасава “Гракі прыляцелі” [5, с. 19]. І сапраўды, назіраецца тая ж чорна-белая гама пейзажу: белы снег і чорнае поле, дзякуючы чаму складваецца ўражанне ўмоўнай графічнасці.

Вясновай тэме прысвечана шмат вершаў Н. Мацяш: “Вясновае”, “Была такая буйная вясна!”, “Апошняя завея”, “Адліга”, “Як доўга не вяртаюцца буслы”, “Бярозавы сок”, “Жанчына вясну прыручыла”, “Вясна восемдзесят сёмага” і інш.

Як пацверджанне нашай думкі аб еднасці жанчыны з прыродай, з яе вечным цыклам адраджэння, што увасабляе вясна, з’яўляецца верш Н. Мацяш “Жанчына вясну прыручыла”. І вясна ў Н. Мацяш хатняя, яна ўвасоблена ў вобразе галінкі, якую жанчына паставіла ў глечык, каб яна зазелянела і прынесла свет і шчасце ў хату. Праўда, з агаворкай: *Што ненадоўга – знала...* [4, с. 98].

Назва зборніка Н. Мацяш “Прыручэнне вясны” – сімвалічная. Чалавеку патрэбна, каб у яго душы заўсёды была вясна, нягледзячы нінаякія жыццёвыя цяжкасці. Патрэбна знаходзіць у сабе сілы, моц, каб адрадзіцца. Ніне Мацяш лёс наканаваў цяжкія выпрабаванні, але яна змагла прыручыць сваю вясну, адчуць сябе шчаслівай, нават узімку для яе *бэзам ускіпае завіруха*.

Вясна – вось вымярэнне жыцця, яго радасць. І сапраўды, творчасць Н. Мацяш адметна верай у светлае, надзеяй, аптымізмам. Даследчык творчасці Н. Мацяш, яе сябра У. Калеснік нават вызначыў канцэпцыю яе творчасці як “канцэпцыю шчасця” [6, с. 4].

Вобраз вясны прысутнічае і ў лірыцы Г. Каржанеўскай. Зразумела, не любіць вясну немагчыма. Але ў Г. Каржанеўскай неадназначныя адносіны да гэтай пары. Так, для адраджэння патрэбна вясновае цяпло:

Што трэба траве,
каб яна ажыла,
Зялёнай зрабілася,
цешыла вока?
Патрэбна адліга,
І трошкі цяпла,
І промень, што доўга блукаў
між аблокаў [7, с. 4].

Г. Каржанеўская вельмі рацыянальна тлумачыць сваю любоў да вясны і нелюбоў да *злой зімы*: *завяршаецца кругазварот (З-за прыроды мы ўсе фаталісты)* [7, с. 49]. І хоць паэтэса з нецярплівасцю чакае надыходу вясновага цяпла (*І так бывае холадна душы, Што першых ручаін не дачакацца* [7, с. 51]), з прыходам вясны ёй не становіцца ўтульна:

Вясна.
Ды холадна цюльпанам.
Не прасыхае парасон.
Не прабуджэнне і не сон [7, с. 54].

Нават чуецца нейкая нотка папроку вясне за няздзейсненыя мары: *Чым я свабоду заслужыла Ад вершаў? Вернасцю вясне?* [7, с. 32]

Так, для лірыкі Г. Каржанеўскай уласцівы больш настраёвыя замалёўкі, псіхалагізаваныя пейзажы. У параўнанні з вершамі Е. Лось, Н. Мацяш, у Г. Каржанеўскай менш спавядальнасці, лірызму, эмацыянальнасці, пейзаж больш стрыманы. Гэта заўважаецца і на мове пейзажнай лірыкі Г. Каржанеўскай, у ёй назіраеца меншая колькасць паэтычных тропаў: метафар, эпітэтаў, параўнанняў, яны менш вобразныя, чым у Е. Лось і Н. Мацяш.

Але ж ці толькі веснавы вобраз паланіў сэрцы нашых паэтэс? У Н. Мацяш сустракаем верш "Я думала, люблю адну вясну", у якім аўтарка прызнаецца, што ў разлуцы з родным краем, ва ўяўленні яна прымае ўсе поры года:

І ўсё прымаю, лета і зіму,
Паводку бурную і ліставею.
Калі зямля, як сонца, душу грэе –
Багаслаўляю лета і зіму! [4, с. 34]

Так, усё, што звязана з роднымі краявідамі, з любай зямлёй, дорага паэткам.

Такім чынам, любоў да прыроды непарыўна звязана з любоўю да роднай зямлі, Бацькаўшчыны, Радзімы. І багацце пейзажных вобразаў прадвызначаецца, у першую чаргу, нацыянальнай карцінай свету.

У беларускай паэзіі нацыянальная карціна свету прадстаўлена шматлікімі вобразамі. Акрамя вобразаў розных пор года ў беларускай літаратуры XX ст. прысутнічаюць вядучыя вобразы дрэў, лесу, дарогі, жытнёвага поля. дажджу, снегападу, навальніцы, раніцы і г. д.

У лірыцы беларускіх паэтэс прырода выступае ў самых разнастайных праяўленнях. Гэта можа быць проста фон для развіцця дзеяння і перажывання. Напрыклад, лірычная гераіня Е. Лось *"Пад шум картлійскага дажджу думала пра Беларусь"* [2, с. 125], а на фоне таямніча-прыгожага берагу Свіцязі адбываецца самагубства дзяўчыны (верш "Свіцязь" Е. Лось). Лірычная гераіня верша Г. Каржанеўскай *"слухала, як дождж ішоў, як стукаў кроплямі па шыбах"* [7, с. 10], і на фоне гэтага пейзажу ў яе ўзніклі думкі пра бацькоў, пра жыццё, пра час.

Пейзаж у паэтычным творы можа быць звычайным прадметам сузіральніцтва і любові. Такія вершы асабліва багаты на моўна-выяўленчыя сродкі і сродкі сінтаксічнай выразнасці.

У вершы "Зазімак" [2, с. 154] Е. Лось захапляецца малюнкам зімы. Незвычайная прыгажосць перадаецца пры дапамозе аднародных эпітэтаў (*ветрам сціплым, золкім, лес маўклівы, амярцвелы, ступой юнацкаю, рашучай*). А на дзедавай зямлі такая прыгажосць, якой няма нідзе (верш "На дзедавай зямлі" Е. Лось [2, с. 175]). Твор здзіўляе багаццем моўна-выяўленчых сродкаў: звароткі (*сынок*), эпітэты (*сінія азёры, тонкі бярэзнік, казачная зямля, баравы край, бэзавы туман*), параўнанні (*бор, нібы званок, зоркі, як зерне*), адухаўленні (*бярэзнік каленямі бялее*), метафары (*бор звоніць, зоркі сыпяцца*). Дынамізм пейзажу надаюць шматлікія дзеясловы руху (*бяжыць, сыпяцца, сеяў, хадзілі*).

Н. Мацяш зачароўваецца пейзажам дажджу (увогуле, ачышчальны вобраз вады, дажджу, навальніцы скразным матывам праходзіць праз яе творчасць) у вершы "Дождж" [4, с. 46]. Да аднаго толькі слова *хмарына* паэтэса падбірае адначасова тры экспрэсіўныя эпітэты: *слівовая, тугая, набрынялая*; *голас бацькі* шчодра адораны адразу двумя параўнаннямі: *як сон, як апёк*.

Але ўсё ж часцей за ўсё пейзаж у творы служыць выказвальнікам настрою і псіхалагічна-эмацыянальнага стану чалавека. Так у адным з вершаў Г. Каржанеўскай "*Як рака на лузе завіваецца, так настрой майго каханага мяняецца*" [7, с. 124]. У вершы "Арабіны" Н. Мацяш сумны восеньскі пейзаж перадае адпаведны настрой лірычнай гераіні. У вершы "Агонь у начы", калі ашалелы вецер у непагадзь, буру, цемру парваў правады, Н. Мацяш усхвалявана, што хтосьці стомлены можа заблудзіцца, і яна шукае свечку, каб з яе акна выглянуў "скупы агеньчык, добры гном начэй" [4, с. 22].

У некаторых вершах пейзаж увогуле выступае як жывая істота, надзеленая ўсімі чалавечымі якасцямі.

Напрыклад, у вершы "Белая ружа" Е. Лось гэта кветка прадстае перад чытачом у выглядзе маладой дзяўчыны-прыгажуні. А ў вершы Н. Мацяш "З якой цярплівасцю..." аўтарка персаніфіцыруе бусліху-маці, размаўляе з ёй, просіць у яе парады. У вершы Г. Каржанеўскай "Маналог паўднёвага дрэва" паэтэса карыстаецца таксама прыёмам увасаблення, укладваючы ў "вусны" дрэва палымяныя словы.

Цікавасць да жыцця прыроды не згасае ў чалавечай душы ніколі, і пагэтаму наша сувязь з навакольным светам спрадвечна ў сваёй духоўнай

аснове. А.І. Бельскі вызначыў беларускую пейзажную паэзію як "Біблію Прыроды, дзе спавядаюцца высокія ідэалы Красы, Чысціні, Мудрасці", а мову пейзажнага жывапісу – "як адзін з асноватворных спосабаў паэтычнага мыслення, жывы космас фарбаў, гукаў і пачуццяў" [8, с. 54].

Так, пейзажная лірыка выконвае прызначэнне ўсёй паэзіі – захаваць Прыроду, Чалавека, Зямлю.

**Літаратура**


1. Бельскі А.І. "Я жыву за дажджом, за вясёлкаю…": Жыццё і лірыка Еўдакіі Лось // Роднае слова. 1999. № 2. С. 5–17.
2. Лось Е. І каласуе даўгалецце. Мінск: Маст. літ., 1998. 367 с.
3. Тарасюк Л. Непадзельнасць // Роднае слова. 1993. № 9. С. 29–31.
4. Мацяш Н. Паміж усмешкай і слязой. Вершы і паэмы (1962–1992). Мінск: Маст. літ., 1993. 301 с.
5. Ігнацюк А. Пытальныя варыацыі на тэму кахання, вясны і партрэтнага вобраза: [Аб лірыцы Н. Мацяш] // Крыніца. 1996. № 4. С. 18–21.
6. Колесник В. Концепция счастья // Заря. 20 сентября 1979. С. 4.
7. Каржанеўская Г. Асенні мёд: Вершы розных гадоў. Мінск: Маст. літ., 1993. 301 с.
8. Бельскі А.І. Пейзаж у беларускай паэзіі (эвалюцыя, паэтыка, сістэма вобразаў): Аўтарэф. дыс. ... д-ра філал. навук: 10.01.01. Мінск, 1998. 60 с.